УДК 94 (476):[377.1:63]-053.81

# РАДЫКАЛІЗАЦЫЯ МАЛАДЗЁЖНАГА РУХУ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1930-я гг.

***Віталій Крывуць***
*Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Баранавічы, Беларусь*

Сацыяльна-эканамічны крызіс канца 1920-х – пачатку 1930-х гг. прывёў да радыкалізацыі маладога пакалення Заходняй Беларусі. Гэты працэс закрануў, у тым ліку, і праўрадавыя маладзёжныя арганізацыі. Адначасова актывізаваліся левыя і правыя маладзёжныя арганізацыі – камсамол і крайнія нацыяналісты. Усё гэта ў значнай ступені перашкаджала рэалізацыі ўрадавай маладзёжнай палітыкі

***Ключавыя словы: радыкалізацыя, моладзь, маладзёжныя арганізацыі, маладзёжная палітыка, міжваенны перыяд, Заходняя Беларусь***

У міжваенны перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі шэраг маладзёжных саюзаў і аб'яднанняў, звязаных с рознымі палітычнымі групоўкамі міжваеннай польскай дзяржавы. Да найбольш значных праўрадавых ці "санацыйных" арганізацый адносіліся Стралецкі саюз "Стралец", Саюз сельскай моладзі "Сеў" – Саюз маладой вёскі (ССМ "Сеў" – СМВ), Саюз польскай дэмакратычнай моладзі (СПДМ), Легіён маладых (ЛМ).

На крайнім левым флангу маладзёжнага руху знаходзіўся Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Таксама да левых саюзаў адносіліся Маладзёжная арганізацыя Таварыства рабочага ўніверсітэту (МА ТУР) і "Цукунфт", якія з'яўляліся маладзёжнымі філіяламі Польскай сацыялістычнай партыі (ППС) і Бунда.

Вялікі ўплыў сярод студэнцкай моладзі мела крайне правая, антысеміцкая "Усепольская моладзь" (УМ), звязаная з польскімі нацыяналістамі. Да правых арганізацый адносіліся клерыкальныя Саюз польскай моладзі (СПМ) і Саюз каталіцкай акадэмічнай моладзі "Адраджэнне" (СПАМ "Адраджэнне").

Неабходна адзначыць, што адным з вынікаў эканамічнага крызісу канца 1920-х – пачатку 1930-х гг. з'явілася радыкалізацыя маладога пакалення. У сувязі з гэтым у Заходняй Беларусі, з аднаго боку, усё большы ўплыў пачалі набываць левыя арганізацыі, з другога боку – узмацнілася актыўнасць правых польскіх нацыяналістаў сярод віленскага студэнцтва.

Репозиторий ПолесГУ

Акрамя таго, узмацніліся радыкальныя настроі і ўнутры "санацыйных" студэнцкіх арганізацый. У сувязі з гэтым ЛМ у красавіку 1935 г. быў нават пазбаўлены патранату "санацыі", паколькі яго "арганізацыйныя метады далёка адышлі ад устаноўленых маральных і ідэйных прынцыпаў" [1, с. 129]. У адказ радыкальныя "младалегіянеры", у тым ліку і із Вільні, стварылі Легіён маладых-Фракцыю. Арганізацыя выступала за неабходнасць перабудовы існуючага ладу такім чынам, каб "у дзяржаўную канструкцыю ў якасці арганічнай фундаментальнай часткі былі ўведзены працоўныя класы". Асновай палітычнага жыцця павінны былі стаць "прынцыпы сапраўднай дэмакратыі". У эканамічнай сферы ЛМ-Фракцыя патрабаваў нацыяналізацыі сродкаў вытворчасці і стварэнне планавай эканомікі [2, с. 8].

Радыкалізацыя закранула і нізавыя структуры "Стральца" і ССМ "Сеў" – СМВ. Так у чэрвені 1933 г. у Супраслі, пад Беластокам, у час сутыкненняў бастуючых тэкстыльшчыкаў з паліцыяй стральцы выступілі на баку рабочых. Два стральца загінулі, што прывяло да выхаду моладзі з мясцовага атраду "Стральца" [3, с. 18]. Справаздачы польскіх улад у другой палове 1930-х гг. паведамлялі аб напружанай сітуацыі ўнутры гурткоў СМВ на Палессі: пра імкненне моладзі пазбавіцца ад кантролю з боку польскіх настаўнікаў, пра выбары ў кіраўніцтва гурткоў "нядобранадзейных асоб", пра варожыя адносіны да польскай дзяржавы [4, арк. 14 – 20; 5, арк. 9]. Падобная сітуацыя складвалася і ў іншых рэгіёнах. Напрыклад, у пачатку 1939 г. у Навагрудку адбыўся суд над 17 камуністамі. Як сведчыла прэса, каля трэці з іх былі членамі СМВ [6, с. 4].

Зразумела, што тут не абыходзілася і без дзейнасці мясцовых камсамольскіх актывістаў. Згодна з дырэктывамі свайго кіраўніцтва, камсамол імкнуўся аслабіць ўплыў праўрадавых арганізацый шляхам агітацыі, байкоту і нават тэрору. Пры гэтым доўгі час пераважалі менавіта метады фізічнага ўздзеяння. Таму, як сведчаць шматлікія архіўныя матэрыялы, барацьба за ўплыў на маладое пакаленне была больш падобнай на звычайныя бойкі паміж вясковай моладдзю. Так, справаздача акруговага камітэта КСМЗБ у Маладзечна (студзень – красавік 1935 г.) паведамляла, што "камсамольцы працаваць сярод стральцоў не ўмеюць, уся праца зводзіцца да боек" [7, арк. 14]. У раёне Крынак Гродзенскай акругі гурток ССМ "Сеў" з 40 чалавек распаўся пасля таго, як камсамольцы пачалі сістэматычна збіваць і запужваць яго членаў на вечарынках [8, арк. 140]. Гвалтоўныя метады не апраўдвалі сябе. "Разагітаваную" такім чынам моладзь было даволі цяжка прыцягнуць на бок КСМЗБ, што і выклікала крытыку з боку партыйнага кіраўніцтва.

Не менш упартым было і супрацьстаянне ўнутры левага лагера. У першую чаргу гэта было вынікам "левага сектанцтва" КСМЗБ, які лічыў МА ТУР і "Цукунфт" сацыял-фашысцкімі арганізацыямі. Радыкальныя патрабаванні гэтых саюзаў абвяшчаліся толькі "фразеалогіяй" і спробай "дапасаваць метады сваёй агітацыі да рэвалюцыйных маладзёжных настрояў" [9, арк. 185]. У адказ сацыялісты і бундаўцы абвінавачвалі камуністаў у раскольніцтве і імкненні манапалізаваць рабочы рух.

На мяжы 1920 – 1930-х гг. КСМЗБ услед за Камінтэрнам звярнуўся да тактыкі "адзінага фронту". Але першапачаткова гэта была толькі форма маскіроўкі ў барацьбе за ўплыў на масы. Планавалася "вырываць масы пралетарскай моладзі з-пад уплыву ППС, ТУР, "Цукунфта" і рэфармісцкіх прафсаюзаў", ставарць у гэтых арганізацыях масавы апазіцыйны рух пад камуністычным кіраўніцтвам [9, арк. 217]. Такая практыка вяла толькі до росту ўзаемнага недаверу. Цэнтральнае кіраўніцтва МА ТУР і "Цукунфта" забараніла сваім пярвічным арганізацыям кантакты з камсамолам.

Тым не менш, камсамольцы здолелі пранікнуць у яўрэйскія рабочыя арганізацыі, што шмат у чым тлумачыцца аднолькавым нацыянальным складам гарадскіх ячэек КСМЗБ і "Цукунфта". Гэта выклікала занепакоенасць польскіх улад, якія ў 1931 г. адзначалі, што "рабочыя групоўкі падпадаюць пад працэс павольнага распаду ў выніку сістэматычнай і ўпартай дэструктыўнай працы з боку камуністаў. Пры дапамозе ўсялякіх ганебных і цынічных сродкаў камуністы прабіраюцца ў рабочыя групы, нават вельмі далёкія ад якіх-небудзь максімалісцкіх лозунгаў, і дурманяць галовы, асабліва маладыя, фантасмагорыяй будучага сацыялістычнага раю згодна з рэцэптурай атаманаў дыктатуры, тэрору і правакацый. Разбіваючы саюзы, ламаючы партыйную дысцыпліну,

ствараючы апазіцыю, каб потым адарваць яе і аб'яднаць яе з такой жа створанай імі апазіцыяй і арганізаваць, як уласную прыбудоўку, новую партыю" [10, с. 108].

Сітуацыя пачала змяняцца ў сярэдзіне 1930-х гг. Згодна з рашэннямі VII Кангрэсу Камінтэрна (чэрвень – ліпень 1935 г.), быў узяты курс на стварэнне сапраўднага адзінага народнага антыфашысцкага фронту ўсіх левых і дэмакратычных сілаў. Задачы камсамолу ў гэтых умовах удакладніў VI Кангрэс КІМ. Першы сакратар ЦК КСМЗБ М. Маслоўскі, які прысутнічаў на кангрэсе, раскрытыкаваў сектанцтва заходнебеларускіх камсамольцаў. Адначасова ён звярнуў увагу на ССМ "Сеў", як найбольш масавую арганізацыю сялянскай моладзі, якую неабходна ператварыць у арганізацыю беларускай сялянскай моладзі. М. Маслоўскі прызнаваў неабходнасць выпрацоўкі сумеснай платформы з усімі нефашысцкімі арганізацыямі "для барацьбы маладога пакалення за нацыянальную свабоду, за адукацыю на роднай мове, за зямлю, працу, мір" [11, с. 53].

Камсамол Заходняй Беларусі здолеў наладзіць супрацоўніцтва з іншымі маладзёжнымі арганізацыямі. Згодна з дадзенымі сучаснай беларускай гістарыяграфіі, да канца 1936 г. адзінафронтаўскія маладзёжныя аб'яднанні ахоплівалі каля 6 000 чалавек [12, с. 77]. Аднак, у большасці выпадкаў гэта былі члены МА ТУР і "Цукунфта", а не праўрадавых саюзаў.

Але нават на левым флангу стварыць паўнавартасны адзіны фронт маладога пакалення не ўдалося. З аднаго боку, камсамол не пазбавіўся цалкам ад "левага сектанцтва" і імкнуўся заняць дамінуючае становішча ў адзіным фронце. З іншага боку, кіраўніцтва ППС і Бунда баялася паліцэйскіх рэпрэсій і не падтрымлівала акцыю адзінага фронту. Аднак самым сур'ёзным ударам для левага маладзёжнага руху і адзінага фронту стаў роспуск Камінтэрнам КПЗБ і КСМЗБ, якія былі абвінавачаны ў супрацоўніцтве з польскімі спецслужбамі.

Зразумела, такія агульныя абвінавачванні не адпавядалі рэчаіснасці. Тым не менш, польскія спецслужбы прыклалі шмат намаганняў у барацьбе з левым радыкальным рухам. у тым ліку яны шырока выкарыстоўвалі метады правакацыі і інфільтрацыі сваіх агентаў у шэрагі камуністычнага і камсамольскага падполля. У барацьбе з антыдзяржаўнай дзейнасцю націск рабіўся менавіта на працы з інфарматарамі – канфідэнтамі. Іх задачай быў збор інфармацыі для паліцыі і правядзенне "дэструктыўных дзеянняў у антыдзяржаўным асяроддзі". Высока цаніліся "ўнутраныя інфарматары", якія маглі выкарыстоўвацца ў камбінацыйных акцыях. Кожнае паліцэйскае ўпраўленне імкнулася стварыць шырокую сетку канфідэнтаў, каб мець поўную інфармацыю пра грамадска-палітычную сітуацыю ў сваёй мясцовасці [13, с. 284 – 286].

Актыўнасць польскіх спецслужбаў стварала надзвычай складаныя ўмовы для канспіратыўнай дзейнасці камсамола. Яны здолелі шырока ўкараніць сваіх інфарматараў у камсамольскім асяроддзі. Так, у справаздачы Брэсцкага акруговага камітэта КСМЗБ (май – жнівень 1934 г.) паведамлялася: "Дэфензіва імкнецца пралезці ў арганізацыі і знутры раскласці іх. У Пружанах і Бярозе-Картузскай яна здолела гэта зрабіць. Гэтыя два раёны зараз цалкам у руках дэфы". У той жа справаздачы адзначалася, што мясцовыя арганізацыі па ініцыятыве старшыні райкама КСМЗБ адмовіліся супрацоўнічаць з акруговым камітэтам [14, арк. 159].

Шкода, нанесеная камсамолу дэфензівай, была вялікай. Акрамя жорсткіх паліцэйскіх рэпрэсій і разгрому падпольнай сеткі, цярпеў аўтарытэт камсамола, узнікаў недавер як унутры арганізацыі, так і за яе межамі, сярод насельніцтва і іншых палітычных арганізацый. У справаздачы Гродзенскага акруговага камітэта КПЗБ (лістапад 1932 г.) адзначалася, што існуе "моцны настрой недаверу да нашай партыі, які пасеяны правакатарскімі элементамі, якія кажуць, што большая частка нашай арганізацыі з'яўляецца правакатарамі" [15, арк. 31].

Тым не менш, улады не здолелі канчаткова падавіць радыкальныя настроі сярод маладога пакалення Заходняй Беларусі. Гэта яскрава выявілася ў студэнцкім асяроддзі Віленскага ўніверсітэту. Тут "санацыі" давялося сутыкнуцца як з левым, так і правым радыкальнымі накірункамі маладзёжнага руху. На старонках праўрадавай прэсы падкрэслівалася, што сярод мясцовых студэнтаў назіраецца працэс радыкалізацыі. Прызнавалася, што радыкалізацыя з'яўляецца масавай, арыгінальнай і вельмі глыбокай.

Выдзялялі нават цэлых чатыры накірункі грамадскага студэнцкага радыкалізму: "дзяржаўны" радыкалізм, камуністычны, нацыянальны і каталіцкі. Гэтыя накірункі ахоплівалі фактычна каля 90% віленскай студэнцкай моладзі і амаль усе студэнцкія арганізацыі. Пад першым накірункам мелася на ўвазе радыкалізацыя праўрадавых маладзёжных арганізацый – ЛМ і СПДМ. Што тычыцца камуністычнага і каталіцкага радыкальных накірункаў, то яны былі прадстаўлены толькі ў Вільні. Пад нацыяналістычнымі радыкаламі мелася на ўвазе "Усепольская моладзь" [16, с. 14 – 16].

Што тычыцца апошніх, то Віленскі ўніверсітэт неаднаразоваператвараўся ў арэну антысеміцкіх хваляванняў, арганізаваных польскімі нацыяналістамі. Повадам да іх служылі два асноўных патрабаванняў прыхільнікаў УМ: абмежаванне колькасці студэнтаў-яўрэяў у вну і прадстаўленне яўрэйскім студэнтам-медыкам для вывучэння выключна яўрэйскіх трупаў [10, с. 94].

Менавіта вакол "праблемы яўрэйскіх трупаў" у лістападзе 1931 г. пачаліся беспарадкі, у час якіх быў смяротна паранены студэнт-першакурснік, член УМ. Пасля гэтага хваляванні перакінуліся з універсітэта ў горад і працягваліся каля 5 дзён. У выніку было паранена некалькі дзясяткаў чалавек, яўрэйская абшчына зафіксавала пашкоджанне маёмасці на суму больш за 100 000 злотых [10, с. 95 – 97].

Акцыі "Усепольскай моладзі" ў Вільні адбываліся і ў наступныя гады. Восенню 1933 г. варшаўскія і віленскія нацыяналісты пачалі патрабаваць увесці ва ўніверсітэтах "гета лаўковага" – асобных мест у аўдыторыях для студэнтаў-яўрэяў і студэнтаў-хрысціян. Пасля 1935 г. універсітэцкая адміністрацыя была вымушана пайсці на гэта. Па прычыне студэнцкіх хваляванняў Віленскі ўніверсітэт зачыняўся ў лістападзе 1932 г., лістападзе 1933 г. і лістападзе 1936 г. У сакавіку 1938 г. на тэрыторыю ўніверсітэта была ўведзена паліцыя. У рамах кампаніі па ўвядзенню "яўрэйскай квоты" з 1937 г. у Віленскім універсітэце рэгулярна праводзіліся "дні без яўрэяў". Вынікам усіх гэтых антысеміцкіх акцый пад кіраўніцтвам УМ было скарачэнне колькасці студэнтаў-яўрэяў у польскіх вну [17, с. 150 – 170].

Для барацьбы з польскімі нацыяналістамі ўлады спрабавалі правесці рэформу вышэйшай школы. Аднак большасць студэнтаў выступіла супраць новага заканадаўства. Пад лозунгам абароны акадэмічнай аўтаноміі аб'ядналіся як правыя, так і левыя. "Усепольская моладзь" выступіла з ініцыятывай студэнцкай забастоўкі. У Вільні яна пачалася 2 сакавіка 1933 г. і суправаджалася блакадай універсітэта. У адказ 4 сакавіка рэктар прыпыніў заняткі. Студэнцкую дэманстрацыю пратэсту разагнала паліцыя. Пры гэтым праўрадавыя арганізацыі – ЛМ, СПДМ, "Стралец" – падтрымалі рэформу і стварылі Антызабастовачны камітэт. Яны звярнуліся да рэктара з просьбай аднавіць заняткі і асудзілі забастоўку як камуністычную і сацыялістычную акцыю. 11 сакавіка заняткі аднавіліся [18, с. 50]. Аднак студэнцтва працягвала сваю барацьбу за акадэмічную аўтаномію і ў далейшым, ужо ў канцы 1930-х гг., міністэрства адукацыі было вымушана пайсці на пэўную змену заканадаўства аб вышэйшай школе.

Акрамя навага заканадаўства ўлады ў сваёй барацьбе з ростам студэнцкага радыкалізму ўскладалі пэўныя надзеі і на свае студэнцкія саюзы. але гэтыя надзеі не спраўдзіліся. Найбольш яскрава гэта выявілася ў Вільні, дзе члены праўрадавых аб'яднанняў актыўна супрацоўнічалі з пракамуністычным Саюзам студэнцкай лявіцы "Фронт". Гэтая арганізацыя пачала складвацца ў 1931 г. у час барацьбы за кіраўніцтва ў студэнцкім самакіраванні. На чале "Фронта" стаяў Г. Дэмбіньскі, былы кіраўнік віленскага аддзялення СКАМ "Адраджэнне". Адначасова сярод лідараў саюза знаходзіліся камендант віленскага ЛМ С. Ендрыхоўскі і кіраўнік СПДМ М. Вінецкі [19, арк. 4 – 8]. Зімою 1932 – 1933 гг. на базе "групы Дэмбіньскага" была створана нелегальная арганізацыя "Фронт", унутры якой існавала і камсамольская ячэйка. У 1933 – 1935 гг. "Фронт" актыўна ўдзельнічаў у барацьбе за эканамічныя правы студэнтаў і супраць новага акадэмічнага заканадаўства. Вялікае значэнне мела і яго выдавецкая дзейнасць. Орган саюза, часопіс "Папросту", дасягнуў тыраж у 12 000 экзэмпляраў, што ва ўмовах міжваеннай Польшчы з'яўлялася даволі высокім паказчыкам [20, с. 58].

Дзейнасць віленскай дэмакратычнай студэнцкай моладзі непакоіла польскія ўлады. Першапачаткова яны спрабавалі перацягнуць студэнтаў на свой бок.

Г. Дэмбіньскаму нават прапанавалі ўзначаліць ЛМ [18, с. 32]. Пасля таго як перамовы правaліліся, супраць "Фронту" распачаліся паліцэйскія рэпрэсіі. Але ўлады, каб не выклікаць непажаданага грамадскага рэзанансу, не сталі падвяргаць студэнтаў-палякаў суроваму пакаранню. Пасля непрацяглага турэмнага зняволення ўсе кіраўніцтва саюза апынулася на волі. Пасля гэтага "Фронт" працягваў сваё існаванне да самага верасня 1939 г.

Такім чынам, радыкалізацыя маладога пакалення, выкліканая эканамічным крызісам, на тэрыторыі Заходняй Беларусі закранула нават членаў праўрадавых арганізацый і з'явілася сур'ёзнай перашкодай на шляху рэалізацыі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. Гэтым скарыстаўся КСМЗБ, які вёў найбольш упартую барацьбу за ўплыў на маладое пакаленне не толькі з уладамі, але і з левымі палітычнымі групоўкамі. У сярэдзіне 1930-х гг. камсамол узяў курс на стварэнне адзінага антыфашысцкага фронту, але па шэрагу прычын яго не ўдалося стварыць. Адначасова актывізаваліся і правыя радыкалы, якія дамінавалі сярод віленскіх студэнтаў. Неабходна прызнаць, што "санацыйны" рэжым так і не здолеў перамагчы сваіх радыкальных канкурэнтаў у асяроддзі маладога пакалення Заходняй Беларусі.


1. Osiński, Z. Janusz Jędrzejewicz – piłsudzyk i reformator edukacji (1885 – 1951) / Z. Osiński. – Lublin: Wydawnictwo UMCS, 2008. – 338 s.
2. Legion Młodych Frakcja // Ku Polsce szklanych domów. Jednodniówka postępowej młodzieży wileńskiej. – Wilno, 1936. – S. 8.
3. Герасімчык, М. «Стралец» – вораг рабочай і сялянскай моладзі / М. Герасімчык. – Вільня, 1934. – 46 с.
4. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 67 сч. Воп. 2. Спр. 1059.
5. ДАБВ. – Ф. 67 сч. Воп. 2. Спр. 1094.
6. 17 komunistów przed sądem w Nowogródku // Kurjer Wileński. – 1939. – 20 stycznia. – S. 4.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 502.
8. НАРБ. – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 449.
9. НАРБ. – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 114.
10. Sprawozdanie z życia mniejszości narodowych za IV kwartal 1931 r. – Warszawa: Wydział narodowościowy, 1932. – 140 s.
11. Toruńczyk, R. Komunistyczny Związek Młodzieży Polski a VI Światowy Kongres Komunistycznej Międzynarodowki Młodzieży / R. Toruńczyk // Z pola walki. – 1965. – № 3. – S. 47 – 66.
12. Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мінск: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 76 – 78.
13. Misiuk, A. Policja państwowa 1919 – 1939. Powstanie, organizacja, kierunki działania / A. Misiuk. – Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PAN, 1996. – 372 s.
14. НАРБ. – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 446.
15. НАРБ. – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 430.
16. Stomma, S. Prądy ideowe wsród młodzieży wileńskiej / S. Stomma // Włóczęga. – 1934. – № 2 – 3. – S. 14 – 16.
17. Pilch, A. Studencki ruch polityczny w Polsce 1932 – 1939 / A. Pilch. – Warszawa: PWN, 1972. – 179 s.
18. Filipajtis, E. Lewica Akademicka w Wilnie / E. Filipajtis. – Białystok: Towarzystwo Naukowe, 1965. – 71 s.
19. НАРБ. – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 509.
20. Gorska, G. Dzieje wilenskiej lewicy. Od „Żagarow" do „Poprostu"/ G. Gorska // Kwartalnik historii prasy polskiej. – 1978. – № 3. – S. 45 – 61.


## THE RADICALIZATION OF THE YOUTH MOVEMENT OF WESTERN BELARUS IN THE 1930 s


***Vitali I. Kryvuts***

*PhD, Baranovichi State University, Baranovichi, Belarus*

*krivut@mail.ru*



**Summary:** The socio-economic crisis of the late 1920 - 1930's. led to the radicalization of young people in Western Belarus. This process involved, including and pro-government youth organizations.

Simultaneously activated the left and right-wing youth organization – komsomol and the extreme nationalists. All this is much more difficult your government's youth policy.

***Keywords: radicalization, youth, youth organizations, youth policy, the interwar period, Western Belarus***

Репозиторий Полесгу